Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

ДУМКА ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12 m. 6). Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.

Непрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата ганарару залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок петыту ў 1 шпальту

№ 2 Вільня, Субота 7-га студзеня 1928 г. Год I

„Прароцтвы“.

У наваголнім нумары „Słowa“ зьмешчаны навагоднія разважаньні—„прароцтвы“ ведамага нашым чытачом Cat'a. Гэтыя „прароцтвы“ найбольш адыведомленага і дзеля гэтага найбольш аўтарытэтнага і шчырага з усіх публіцыстаў — санацыі, найлепш усяго, найвыразьней, з „точкамі над і“ кажуць нам „да чаго мае йсьці“, калі словы гэтага прарока Санацыі, настолькі-ж сільныя, як і голасныя.

Некалькі месяцаў таму назад пад надобным загалоўкам у„адной з радыкальных беларускіх газэт была ў гэтай справе зьмешчана стацьця, але да чытачоў не дайшла, можа цяпер хоць славамі пана Cat'a дазволена будзе даведацца аб гэтым беларускім сялянска-работніцкім гушчам.

—:—

Пачнем ад унутраных спраў Польшчы, якія тут нас перадусім цікавяць. Вось, што „прарочыць“ у гэтых справах пан Cat: „1) ліквідацыя дэмакратыі ў Польшчы, 2) павялічэньне антагінізму між „ляўцовымі“ (чужаслоўны нашы—Рэд) партыямі і санацыяй, 3) разьбіцьцё эндэцыі“. І так, паводлуг Cat'a, пойдзе да „ліквідацыі дэмакратыі“. Як гэта равесьці і праводзіцца ў жыцьцё, гэта кожны ў нашы часы добра ведае, тым больш ня цікавіць гэта пана Cat'a, ня варта казаць і нам. Ня кажа пан Cat таксама і для чаго гэта робіцца і якое гэта мае значэньне для шырокіх мас сялян і работнікаў. Згодна з сказаным намі на пачатку, пакідаем гэта для высьвятленьня на іншы раз і ў іншым месцы. Пана Cat'a цікавіць толькі пытаньне, якім чынам дасягнуць гэтага не ламаючы канстытуцыі. Тут яго ўзрок і спыняецца на Сойме. Вось, што „прарочыць“ нам на гэтаму повадзе пан Cat: „Ліста № 1, якую запрапануе урад выбаршчыкам... не здабудзе 230 мандатаў (444 агульны лік паслоў у Сойме—Рэд.) г. з большасьці. Большасьць па ліку будзе належыць да партыяў нязадольных утварыць парлямантарны урад, бо гэтая большасьць будзе складацца, як з эндэкаў, гэтак сама і з камуністаў. Знача і на далей будзем мець урад меншасьці. Дзеля таго-ж, што ўрадовая партыя не будзе партыяй, а шэрагам асоб, маючых даверые Маршалка, дык гэты ўрад меншасьці будзе ўрадам аднаго чалавека“.

Гэтага аднак мала—п. Cat разьвівае абраз далей.

„Аслабленая эндэцыя „будзе ў Сойме пастаўлена супроць сільнага ўрадовага лагера і працінікаў дзяржавы: меншасьцей і сацыялістаў. На выбары эндэцыя пойдзе з проці—ўрадовымі лёзунгамі... У Сойме эндэцыя надтрымае ўрадовыя групы, бо будзе пастаўлена перад выбарам між дзяржаўнікамі і процідзяржаўнікамі (чытай злучніцаю з рэштай вызвалены да абароны супольных інтарэсаў).

Не абмінае таксама п. Cat і каталіцкай царквы:

„Ватыкан, як палітычны дзейнік, заўсёды займае нэйтральную пазіцыю на паваротах гісторыі. Пры ўзмацаваньні Польшчы Ватыкан не захоча, каб каталіцкае духавенства прымала ўдзел у апазіцыйнай групе. Тым больш, што апазіцыя супроць ураду Пілсудскага будзе безнадзейнай, а знача бязмэтнай.

Ясна што пры гэтай сітуацыі з П. П. С. няма чаго лічыцца. Маўр зрабіў сваю справу. Маўр можа адыйсьці“.

Вось як мае быць праведзена па словах „прарока“ Cat'a ліквідацыя дэмакратыі.

Найбольш цэннымі і цікавымі зьяўляюцца для нас прароцтвы пана Cat'a ў нацыянальным пытаньні: „нацыянальныя справы ў Польшчы ў 1928 годзе вырашаны ня будуць. Польская Дзяржава сёньня на гэтулькі сільна, што не патрабуе старацца аб прыдбаньні сымпатыяў нац. меншасьцяў. Бяссільле Сойму будзе таксама бяссільлем тых палітычных груп, якія меншасьці вышлюць да гэтага Сойму“.

Вось што казаў нам на Новы Год „прарок“ Санацыі. Дзякуем за шчырасьць. Точкі над і пан Cat' паставіў дасканальна.

—:—

А „Сялянскія Нівы“ ды „Крыніцы“ яшчэ так голасна крычаць аб пасольскіх падушках, якіх ужо забракавана п. п. Ярэмічам і Рагулям. Ці-ж не ашуканствам перад працоўнымі гушчамі зьяўляецца гэты клопат аб пасольскіх мандатах. У пагоне за мандатамі гэтыя паны гатовы зрабіць усе. Не, паночкі, ня лжэце, не ў „бяссільным Сойме“ ратунак беларускіх працоўных мас, а ў іх сьвядомасьці ў іх арганізаванасьці, стойкасьці; іх ратунак ня ў Сойме, а ў іх самых.

Ня „праца“ на груньце „бяссільнага Сойму“, а праца сярод мас, іх усьведамленьне і арганізаваньне, навялічэньне актыўнасьці,—вось што павінна быць абавязкам паслоў, бароначых інтарэсы мас.

Няма-ж чаго ілюзіямі карміць масы заведамай няпраўдай, што нешта там у Сойме зробіцца, адваюецца на яго карысьць. Але ў гэтым то якраз і ёсьць сутнасьць угоды.

Развал Паулюкевічаушчыны.

Пісьмо у Рэдакцыю.

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

Далучаючы да гэтага дэкларацыю аб выступленьні з Паўлюкевічавых арганізацыяў, прашу Вас выдрукаваць яе ў газэце „Думка Працы“, а такжа прашу Вас на будучыню стаць у маей абароне ад атакі Паўлюкевічаўцаў у Вашай паважанай газэце.

Апрача таго, прашу копію маей дэклярацыі аб выступленьні перадаць, калі знойдзецэ патрэбным, іншым беларускім і польскім газэтам.

Спадзяюся, што калі дойдзе да ведама Паўлюкевіча аб маім выступленьні, дык зараз ён пачне крычаць, што я быў да яго падасланы. Дык паведамляю Вас, што процiў гэтага скажуць яго пісьмы з просьбай, каб я далучыўся да яго са сваёй групай на чале з Акружным Камітэтам.

Яшчэ пра мяне скажа „Беларускае Слова“, дзе шмат пісалася аба мне.

З пашанай Мацей Пятровіч.

Дэклярацыя.

Мы, ніжэйпадпісаныя, пакідаючы „Вызваленьне“, паверыўшы пекным словам „Доктара“ Паўлюкевіча і далучыліся да Беларускай Нацыянальнай Рады і Партыі. Ён гаварыў, што яго арганізацыі дэмакратычныя і вядуць барацьбу за вызваленьне шматпакутнага беларускага селяніна і работніка, за тэрытарыяльную і культурна-нацыянальную аўтаномію і што наступова будзе будаваць Незалежную Злучаную і Вольную Беларусь. Ой, як жа мы глыбока памыліліся, бо пераканаліся, што праграма Б. Н. Рады і яе дачкі—Беларускае Нацыянальнае Партыі дэмакратычныя толькі на паперы, а за плячыма абедзьве гэтыя арганіз. маюць супольную тайную праграму чыста беларуска расейскіх манархістаў, якія, прыкрываючыся лёяльнасьцю да Польшчы, беларускасьцю арганізацыі і барацьбой з камуністымі—спэцыяльна скіравалі сваю працу на шкоду працоўнага народу... (Далей падаюцца факты, ясна даказваючыя справядлівасьць гэтае думкі, якія аднак з увагі на бязумоўнае наражэньне газэты на канфіскату, апускаюцца. Рэд.).

Апрача гэтага, Белар. Нац. Рада і Беларуская Нац. Партыя маюць сваю „дабрадзейную“ арганізацыю „Прасьвета“. Гэта арганізацыя мае на мэце, вядучы „культурна-асьветную“ працу, узгадоўваць беларускую моладзь у духу манархічным, выпуківаючы пасярод яе „гэрояў“, вось такіх гадунцоў, як Барыс Кавэрда, якія б па прыказу былі гатовы на ўсё... (Тут ізноў прапушчана, каб захаваць газэту ад канфіскаты. Рэд.).

Мала гэтага, надышлі выбары да Сойму і задумаў Паўлюкевіч са сваей сьвітай улезьці ў Сойм ды і давай арганізоўваць розныя Камітэты ды Зьезды. Вось гэтакім чынам склікаў зьезд да Вільні ў днях 6 і 7 лістапада г. г. сваіх агэнтаў, сяброў Рады, Партыі і Прасьветы, куды таксама былі запрошаны некаторыя беларусы Радныя і войты; гэты зьезд назваў Паўлюкевіч „Першым Зьездам Гмінных Радных—Беларусаў у Вільні“, нібы-то скліканым беспартыйным камітэтам па справам самаўрадаў, вызначаным Паўлюкевічам некалькі месяцаў назад перад зьездам. Хітры Паўлюкевіч на закід аднаго з прысутных—„што гэта ваўкі ў авечай скуры сядзяць за сталом“, адказаў, што ён барацьбіт за лепшую будучыню беларускага народу і пакутнік за ідэю Беларусі, абы толькі мандацікі лавіць—як рыбку ў мутнай вадзе. Ён частаваў усіх і даваў грошы на дарогу, бо гэтага добра ў яго хапае — дзякуй богу, нябедны...

Калі на Зьезьдзе былі даны адозвы прадстаўнікоў беларускіх працоўных мас, то панок Паўлюкевіч сам павырываў з рук дэлегатаў і навет вырваў з рук старшыні Зьезду аднаго з падпісаўшых Мацея Пятровіча, войта Палачанскае гміны і расставіў па ўсіх кутках і каля дзьвярэй сваіх агентаў, якім плаціў вялізныя сумы, каб нікога чужога не дапускаць да сяброў Зьезду.

Дзеля вышэй сказанага, пераканаўшыся, што Бел. Нац. Партыя і Рада, як усе і іншыя Паўлюкевічавы арганізацыі — ёсьць спулка буйных абшарнікаў, капіталістаў і беларуска расейскіх манархістаў, жадаючых налажыць аковы вечнай няволі на працоўныя масы ды заліць у крыві вызваляючы рух сялян і работнікаў — выходзім з Б.Н.Р. і Партыі, Прасьветы, Камітэту па справам Нацыянальнага Выбарчага Камітэту, а таксама заклікаем усіх чэсных сяброў, пакінуць гэтую арганізацыю міравых разбойнікаў і тварыць сваю ўласную арганізацыю працоўных мас.

Віцэ-старшыня Цэнтральнага Камітэту Б. Н. Р. і Партыі, Паўнамоцнік — Інструктар Беларускага Т-ва „Прасьвета“ на паветы: Маладэчанскі Валожынскі і Ашмянскі. Паўнамоцнік — Інструктар Цэнтральнага Нацыянальнага Выбарчага Камітэту, сябра К-ту па справам Самаўрадаў і Старшыня Першага Зьезду Гмінных Радных Беларусаў у Вільні: Мацей Пятровіч.

Сябры: Язэп Садоўскі, Герасім Садоўскі і Анатолі Бурачонак. далей подпісы ня чытэльныя.

Ад Рэдакцыі: Зьмяшчаючы пісьмо Я. Пятровіча і дэклярацыю б. б. сяброў Паўлюкевічаўскіх арганізацыяў, горача вітаем гэты запраўды мужны шаг сялянскіх прадстаўнікоў, якія, будучы колькі часу абдурваны праз банду палітычных брадзягаў, упягнены ў іхнюю брудную працу і навет высунутых на чалавыя месцы — урэшце пазналі запраўдны бок дзеяльнасьці гэтых агентаў і польскай буржуазіі і расейскіх чорнасоценаманархістычных работнікаў,—і паступілі так, як дыктавала ім іх сялянскае пачуцьцё і сумленьне.

Прыймаючы пад увагу, што гр. Я. Пятровіч, як і яго калегі, былі ў арганізацыях Паўлюкевіча прадстаўнікамі сялянства, прытым самымі акрыўнымі, якія надавалі шулерскім арганізацыям нейкую ілюзію грамадзкасьці і сувязі з сялянствам і гэтым давалі самой бандзе козыр у рукі перад тымі, каму яны верай і праўдай служылі — шаг гэтых сялянскіх прадстаўнікоў разьбівае ўшчэнт і гэтыя ілюзіі і гэтыя козыры.

Мы былі пэўныя, што ўчасьце сялянскіх прадстаўнікоў у Паўлюкевічаўскіх арганізацыях ніколі ня было шчырым і ідэйным, што яны заўсёды разумелі запраўдны бок „працы“ паўлюкевічаўскай банды і толькі прыглядаліся да яе бліжэй, каб пазнаць гэтую мэханіку абману, круцельства, ашуканства і каб расказаць аб ёй сваім братом—сялянам.

Об'ектыўна гледзячы — учасьце сялян у лўна ашуканчых арганізацыях трэба тлумачць тым агульным прабуджэньнем драмаўшых у народзе сілаў, якія пасьля разгрому сваіх арганізацыяў будучы пазбаўлены таго цэнтру, каля якога яны маглі гуртавацца і знайсьці поле для дзеяльнасьці — дакатваліся і да Паўлюкевеча.

Мы ведаем, што гэтая прабуджаная сялянская энэргія ўлілася і ў другія здрадніцкія арганізацыі, як розныя „Сельсаюзы“ Ярэміча і Рагулі, хрышчовыя дэмакратыі кс. Станкевіча і Багдановіча — (не гаворым ужо аб Гурынаўшчыне, здраднай Паўлюкевічаўшчыне і інш.) якія таксама служаць інтарэсам ворагаў беларускага працоўнага народу, прадаюць народныя гушчы польскай і міжнароднай буржуазіі і самі выяжджаюць на няшчасьці працоўных.

Шаг гр. Я. Пятровіча і яго калегаў уважаем за першы шаг сьвядомага і адважнага выступу актыўных сялянскіх сілаў процi дэфэнзыўных і здрадніцкіх арганізацыяў наагул. Мы пэўныя, што ў гэты рашучы мамэнт выбарнай барацьбы, барацьбы фактычна за душу беларускіх працоўных гушчаў— усе актыўныя і сьмелыя сілы з гэтых гушчаў зробяць так, як падкажа іх сялянска-работніцкае сумленьне і падобна дэклярантам, не пабаяцца публічна выявіць перад сваімі братамі запраўдную сутнасьць дэфэнзыўных і здрадніцкіх арганізацыяў. Трэба помніць, што выбары даюць магчымасьць апэраваць ад імя выбаршчыкаў аж пяць гадоў і калі мы дамо гэтае права ашуканцам—яны ўсе гэныя пяць гадоў будуць таргаваць і нашым імем і намі самымі.

Хай выступ дэклярантаў будзе клікам у гроб ня толькі Паўлюкевічаўскай бандзе, а і ў гроб усіх здрадніцкіх „павадыроў“. Беларускія сяляне і рабочнікі, будуць праводзіць толькі свае сялянска-работніцкія сьпіскі!

„Прароцтвы“ японскага пасла у Пэкіне.

Добра ведамы і добра даўшыся ўжо ў знакі кітайскаму народу японскі пасол у Пэкіне Іошыкава зрабіў—з прычыны Новага Году—эўрапэйскім журналістам у Пэкіне вельмі „цікаўныя“ заявы і прароцтвы... Пасол Іошыкава—найлепшы „знаўца“ ў Японіі кітайскіх спраў ды—незамянімы спэцыяліст па арганізацыі... японскага „мірнага заваяваньня“, прасьцей: надбою Кітаю...

Гэты—найвыдатнейшы дыплёмат, якога Японія колькі разоў мелася выкарыстаць для больш шырокай дзеяльнасьці — на становішчы міністра ці прэм'ера. Але заўсёды і ён сам і кіруючыя колы японскага імпэрыялізму пакідалі яго на яго „кітайскай пляцоўцы“, ведаючы добра, што—„прышласьць Японіі—не на няпэўных (зямлітрасеньні.!?) японскіх астравох, але—на пэўным кітайскім матэрыку“...

Дык вось гэты японскі „рэчазнаўца для кітайскіх спраў крэсовых“ распачаў свае заявы журналістам—з цікаўнага „прароцтва:— „1928 год мае быць—па моему перакананьню—найбагацейшым здарэньнямі годам — у-ва ўсей кітайскай гісторыі“...

„Хатняя вайна ня толькі ня мае спыніцца, але-ж—наадварот—мае страшэнна завастрыцца. Але... але вайна будзеісьці ўсьцяж—не паміж якімі там партыямі ці кня-

самі,—не: надалей будуць ліць кроў кітайскага народу... паны „маршалы“, ці губэрнатары („мандарыны“) паасобных правінцыяў Кітаю...

„Войскі гэтых маршалаў, цяпер яшчэ вялічкія, але растучыя з дня на дзень, у працягу будучага году зробяцца запраўднымі магутнымі арміямі... Тады хатняя вайна ў Кітаі можа дайсьці да разьмераў мінуўшай Вялікай Эўрапэйскай вайны, — пры ўсім іншых, зразумела, тэхнічных, стратэгічных ды гаспадарчых варунках на кітайскіх абшарах... Палажэньне краю і яго насяленьня зробіцца адчайным... Але, ня гледзячы на гэта, трэба лічыць, што — ніякія запраўдныя народныя паўстаньні, ці рэвалюцыі, ня будуць ужо больш магчымымі... Усе прадбачаньні такіх рэвалюцыяў, такія папулярныя цяпер, тлумачацца толькі поўнай незнаёмасьцю з мясцовымі варункамі ў Кітаю... Народ будзе і надалей толькі паміраць пачком ад мору і галадухі... Што найбольш, дык, можа, дзе-нідзе здарацца якія спробы самаабароны з боку сялянства“. Нарысаваны з смакам гэткі мілы сэрцу знявindependentўшых кітайскі народ жываедаў-імпэрыялістаў абраз „сумакоснага Кітаю“, у выніку страшэннай няўдачы—дзякуючы здрадзе яго „павадыроў“—вялікага вызвольнага руху ў Кітаі ў мінулым годзе, японскі „рэчазнаўца“ слушна кажа далей, што—„вялікім дзяржавам астанецца ў крымінальнай толькі карэктна падтрымліваць поўны нейтралітэт, ня гледзячы на тое, на карысьць каго з гэтых маршалаў будзе схіляцца часовая перамога ў гэтай хатняй вайне ў Кітаі“... Вялікім дзяржавам астанецца толькі, дададзім, — прадаваць гарматкі ды амуніцыю ўсім мілым іх сэрцу дабрадзеям-маршалам, якія сумленна ўсьцяж будуць працаваць на карысьць гэтых вялікіх дзяржаваў, старанна зьнішчажаючы—пільна на мільёну—кітайскі народ, які запраўды-ж расплодзіўся так няпрылічана, што самі жываеды—усімі сваімі фабрыкамі і заводамі ня могуць „абмяжаваць“ яго пладзіньне, зарабляючы працай на іх жалі... і маладлётніх...

Вялікія дзяржавы, сьцьвярджае „рэчазнаўца“, будуць толькі спакойна прыглядацца да гэтай „працы“ паноў маршалаў, якія будуць рабіць на ёй — „сьвятыя інтарэсы“, дзеручы карысьці з абодвух бакоў—з народу ды з краю, рабуючы абодвух, і—з сваіх прыяцеляў-жываедаў — за „зьнішчажэньне кітайскага нацыяналізму“...

Японскі „рэчазнаўца“ дадаў, што Японія заўсёды прапанавала вялікім дзяржавам такую „мірную тактыку ўстрыманьня ад інтэрвэнцыі ў кітайскія справы“—бо ж заўсёды тасавала яе сама“... І дзяржавы толькі цяпер зразумелі слушнасьць Японіі дый пастанавілі сьледаваць яе прыкладу...

„Зразумела, што гэтая „мірная тактыка нэйтралітэту“ зусім ня выключае дарадных ваенных экспэдыцыяў паходаў у тыя ці іншыя мясцовасьці—у разе гвалтоўнай патрэбы—абароны накрыўджаных інтарэсаў тэй ці іншай дзяржавы“... Але ведама-ж,—гэта — вынятні з агульнага правіла аб „карэктным нэйтралітэце“, якога пастанавілі сумленна трымацца дзяржавы... У канцы японскі „інструктар па жываедству“ дадаў, што Пэкінскі ўрад і іншыя ўрады Кітаю ўсьцяж зьвяртаюцца да вялікіх дзяржаваў—ну, ведама-ж,—з просьбамі — аб грашовых пазыках „на агульна кітайскія мэты“...

Гэтыя ўрады цьвердзяць, што значныя пазыкі—дапамогуць хутчэй завясьці ў Кітаі парадак дый адбудаваць адзінства краю... Але,—шчыра дадае „рэчазнаўца“, — дзяржавы пастанавілі на ўсе гэткія просьбы адказываць адмоўна...

Ну, ясна ж: каб дзяржавы самі на сваю галаву давалі грошы, адбудоўваючы нейкае „адзінства Кітаю“, калі ім — выгадна ды карысна якраз яго разьбіцьцё на кавалкі на-між розвымі „маршалкамі“.—Няма дурняў... Не!—„Хай сьпярша наступіць у краі сам сабой—у выніку „хатняй вайны“ паміж маршалкамі“—мір, парадак і адналітасьць... пазбаўленага ўсяго насяленьня Краю... А тады будзе і мазыка—„на агульна кітайскія мэты“...

Аднімы выкятак робіць з лёсаў усяго „адналітага Кітаю“ японскі рэчазнаўца—для Манчжурыі...—Тутака у тым краі, дзе Японія заінтарэсавана беспасрэдне, ніякай анархіі ды „хатняй вайны“ паміж маршалкамі Японія не дапусьціць... Чаму?—Ну, яна-ж, чаму!. — Таму, што Манчжурыю Японія лічыць ужо больш Японіяй, як Кітаем... А ведама, што „прыглядацца з нейтралітэтам да разграбленьня свайго ўласнага краю, — таксама „спакойна“, як гэта робіш адносна да чужога, на якога бязсе хочаш толькі „зрабіць інтарэс“, пагрэўшы рукі, гэта-ж ужо, выбачайце,—дурната...

У канцы сваіх цынічна-адкравенных прароцтваў сумнага лёсу кітайскага народу японскі рэчазнаўца ў справах — плянавага зьнішчажэньня цэлых валізарных народаў—кажа, што „ўзіме, трэба думаць, асаблівых здарэньняў у Кітаі ня будзе, але вось у летку новага году трэба спадзявацца—„вельмі паважных падзеяў „на кітайскай тэрыторыі...

— —

Калі слаўнага „жалезнага канцлера“ Бісмарка запыталіся, ці прызнае ён магчымасьць прароцтваў у палітыцы, ён дасьціпна адказаў: „Чаму-ж не?! — Трэба толькі, каб ваш прарок меў... аружную сілу, — сам фактычна рэалізаваў свае прароцтвы на дзеле“... Так, дадамо ад сябе, гэтыя „палітычныя прароцтвы“ робяцца проста ўжо тым, што ў нас завецца—палітычнай праграмай — дзяржавы, ураду, партыі...

„Прароцтвы“ японскага жываеда аб „лёсе Кітаю“—паводле добрага азначэньня Бісмарка—зьяўляюцца нічым іншым, як — згары абдуманай, детальна апрацаванай і паступова рэалізаванай праграмай плянавага і пасьлядавальнага зьнішчажэньня Японіяй і яе калегамі—жываедамі з Эўропы і Амэрыкі—кітайскага народу, на зямлю якога Японія перадусім заяўляе сваю прэтэнзыю...

Для нас, беларусаў, гэтая японская „ідэолёгія“ зьяўляецца асабліва цікаўнай...—Бо мы памятаем, як у адной з віленскіх газэтаў (здаецца,—у „Газэце Краевай“)... некалькі гадоў таму быў надрукаваны артыкул „ведамага“ Влад. Студніцкага, зьмяшчаўшы якраз падобную, падрабязна апрацаваную аўтарам „праграму“ плянавага і поўнага зьнішчажэньня на ўсходніх Крэсах Польшчы ўсяго няпольскага насяленьня — на вёсцы беларускага сялянства, у месьце ды мястэчку—жыдоўскага мяшчанства — ў мэтах... „Ачышчэньня краю“ ды звальненьня ў ім месца для польскага калёніста-асадніка...

Дзе цяпер гэты „знакаміты“ польскі публіцыст і „эканаміст“, і „выдатны знаўца спраў крэсовых“... Нешта аб ім—ад таго часу амаль што ня чуваць у Польшчы!

Выбарная хроніка.

Беларусы—выбаршчыкі
Сяляне і Работнікі!

Прыміце да ведама, што ад студзеня с. г. ужо выложаны на ўсіх абводовых камітэтах сьпісы выбаршчыкаў. Спраўджайце, ці ўнесены вы ў гэтыя сьпіскі, скаўняйце свой грамадзкі абавязак. Помніце, што ворагі вашы будуць старацца выкідаць Вас са сьпіскаў выбаршчыкаў, каб такім чынам пазбавіцца непажаданага пры выбарах элементу. Але-ж на гэтым уцерпяць Вашы ўласныя інтарэсы, бо выкінены са сьпіскаў выбаршчыкаў ня змогуць аддаць свой голас за свой нумар, нумар працоўных Беларусі.

Дык усе, як адзін, ідзіце ў свае абводовыя камітэты, спраўджайце, ці ўнесены Вы ў сьпіскі выбаршчыкаў і калі не, то дамагайцеся, каб Вас унесьлі ў сьпісак, кіруючыся ніжэй наданай інструкцыяй:

Сьпіскі выбаршчыкаў.

Найпазьней у 20-ты дзень ад абвяшчэньня выбараў (пры нашых выбарах — 15 студзеня 1928 г.) начальнікі гмін складаюць для кожнага абводу сьпісак выбаршчыкаў у 3-х экзэмплярах у альфабэтным парадку, проці кожнага прозьвішча павінна быць зьмешчана імя, прафэсія, дзень, месяц і год нараджэньня, або век і нарэшце дату, ад якой выбаршчык пражывае ў абводзе. (Арт. 32)

Выбаршчык павінен быць упісаны ў сьпіс выбаршчыкаў таго абводу галасаваньня, у якім ён пражываў перад днём абвяшчэньня аб выбарах у Дзен. Устаў. (Арт. 33).

Найпазьней у 21 дзень па абвяшчэньню выбараў начальнік гміны павінен пераслаць 3 экзэмпляры сьпіску выбаршчыкаў Старшыні адпаведнае Абводовае Камісіі, а Старшыня неадкладна склікае Камісію і прадстаўляе ёй сьпіс для разгляду і зацьвярджэньня; Камісія мае права затрэбаваць ад начальніка гміны, каб ён прадставіў матэрыялы, на падставе каторых быў укладзены сьпіс, а таксама, каб ён даў выясьненьні.

Найпазьней у 27-мы дзень ад абвяшчэньня выбараў Абводовая Камісія мусіць пераслаць адзін экзэмпляр зацьверджанага сьпіску ў Акружную Выбарчую Камісію і адначасна публікуе ў гміне, што сьпіс выбаршчыкаў будзе выстаўлены для разгляду ў памешканьні Камісіі (арт. 34).

Сьпіскі выбаршчыкаў будуць выстаўлены для перагляду на 14 дзён, пачынаючы ад 26-га дня ад абвяшчэньня выбараў (ад 2 да 15 студзеня с. г. пры нашых выбарах) у памашканьні ўрадовым Абводовае Камісіі што дзенна на 6 гадзін і то ў такую пару, каб умажлівіць усім выбаршчыкам перагляд сьпіску. Падчас перагляду сьпіску выбаршчыкі маюць права рабіць нататкі і выпіску з сьпіску, не перашкаджаючы пераглядаць іншым.

Найпазьней да 42-га дня ад абвяшчэньня выбараў кожны грамадзянін мае права падаць у Абводовую Камісію рэклямацыю проці неўнясеньня яго самага ў сьпіс, ці каго-небудзь іншага, а таксама проці ўнясеньня ў той сьпіс асоб, пазбаўленых выбарчага права. Рэклямацыі могуць падавацца на пісьме, ці на словах (у апошнім выпадку трэба дамагацца ўнясеньня рэклямацыі ў пратакол); рэклямацыя павінна зьмяшчаць ў сабе доказы слушнасьці, паскольку не датычацца фактаў агульна ведамых. Усе рэклямацыі павінны быць іменныя. У працiўным выпадку яны ня будуць разглядацца (арт. 35).

Форма рэклямацыі за сябе.

REKLAMACJA.

Do Okręgowej Komisji Wyborczej w . . . .

(Imię i nazwisko), zamieszkały w . . . . uprasza . . . . o zamieszczenie go w spisie wyborców do Sejmu i Senatu (miasta) . . . . gminy . . . ., gdyż jak wykazuje załączony (poświadczony odpis dowodu osobistego, paszportu rosyjskiego, wyciągu z ksiąg ludności, książeczki legitymacyjnej, dokumentu wojskowego, książki meldunkowej i książki robotniczej), podpisany liczy lat . . . jest obywatelem Rzeczypospolitej Polskiej, z zawodu . . . . i mieszka od dnia . . . . 192 . . r. (w mieście) . . . . (gminy) . . . ., a nie jest wedle obowiązujących ustaw pozbawiony prawa wyborczego.

Miejscowość . . . . Podpis . . . .

Data . . . .

У рэклямацыі трэба зазначыць толькі той дакумэнт, які ёсьць у асобы, якая дамагаецца ўнясеньня яе ў сьпіс; так напрыклад, калі маецца „довод особісты“, то пішацца „załączony poświadczony odpis dowodu osobistego . . .“, а ўсё далей ня пішацца да слоў: „podpisany liczy lat . . . да рэклямацыі далучаецца копія дакумэнту, пасьведчаная сьвяшчэньнікам, гмінаю, ці якою-небудзь урадаваю ўстановаю.

Форма рэклямацыі за іншых асоб

REKLAMACJA.

Do Obwodowej Komisji Wyborczej w . . . .

(Imię i nazwisko), zamieszkały w . . . . uprasza . . . . o zamieszczenie go, mieszkańców wsi (miasta) . . . . (takich to) w sprawie wyborców do Sejmu i Senatu (miasta) . . . . (gminy) . . . . gdyż oni liczą ponad 21 rok, są obywatelami Rzeczypospolitej Polskiej i mieszkają stale we wsi (mieście) . . . . (gminy) . . . ., a nie są wedle obowiązujących ustaw pozbawione prawa wyborczego.

Miejscowość . . . . Podpis . . . .

Data . . . .

Маленькі фэльетон.

Быу паслом.

Пан пасол Падліза вёз журасную навіну да хаты: Сойм і Сэнат распушчаны і... ён болей не пасол...

Цяжка задумаўся пасол і з вялікага жалю задрамаў на лаве.

— А гэта што за пан такі? Адзін разлёгся на ўсю лаву, а мы стаяць мусім!

Усхапіўся пасол, працёр вочы і бачыць, што наўмыткі вагон сялян надыйшло, наварнуцца недзе.

Першы раз за пяць гадоў свайго пасольства пан пасол Падліза ехаў у „трэцьцяй клясе“. Першы раз за гэтыя пяць гадоў ён сустрэўся твар у твар з сялянамі, абаронцам якіх ён калісьці абяцаўся быць.

— Які брудны народ і потам сьмярдзяць,—падумаў ён сам сабе.

У вагоне было душна і накурана махоркай, круціў носам і ўсё паглядаў на гадзіньнік.

Прыслухаўся ён і чуе, як сяляне аб новых выбарах гавораць. Яго гэта зацікавіла.

— Не, цяпер скулу ў бок,—кажа адзін з сялянаў, нас больш не ашукаюць. Кожнаму панскаму брахуну фігай нос падатрэм. За пяць гадоў мы добра дазналіся, хто нашыя браты, а хто ворагі.

— Але, але, ворагі... ворагі, — сказаў стары селянін і закашляўся. Вунь пры тых выбарах нашу вёску „вызваленцы“ апанавалі. Чаго, чаго толькі яны нам не дакляроўвалі: і зямлю і лясы і дапамогі. Мы паверылі ім і за іх галасавалі. Нам як было кепска, дык яшчэ горай стала, а паслы, чутно, сабе фальваркі і маёнткі пакуплялі.

— Хто быў спрытнейшы, той купіў. Але вось у нашым вокрузе прайшоў пасол-„вызваленец“ нейкі Падліза. Я яго ні разу ня чуў і ня бачыў; няведаю навет, як ён выглядае. Дык пра яго вось што апавядаюць:

Гэта вядомы п'яніца і гуляка. Праматаў сваю гаспадарку, але язык меў спрытны, дык і ў паслы папаў. Адразу, як яго выбралі, дык ён нос у гору задзёр і зрабіўся панам, што бяз фігі носу не дастанеш,—куды ты мяне вядзеш, пусьці мяне к чорту!..

Пан Падліза скоса паглядзеў на апавядальніка, але маўчаў: стыдна яму прызнацца. А селянін казаў далей:

— Пачаў апранацца, як пан, залатых зубоў настаўляў. Жонкі, дзяцей адрокся, да варшаўскіх панёнак пачаў падлізвацца. Як атрымае пасольскую пэнсыю,—дык забярэцца да рэстарацыі і гуляе да апошняга грошыка. Набярэць наўнюткую кватэру дзяўчат і забаўляецца з імі, як султан турэцкі. Гавораць, што аднойчы, відаць, добра заліўшы вочы, казаў віно ў ванну ліць і там дзяўчыну купаў. Затое нешта і сталася з ім—ад доктара ня вылазіць.

— Дык вось якога мы пасла маем, бадай ён пропадам прапаў і з сваім „Вызваленьнем“.

— Не, ужо дудкі, — адазваўся другі, цяпер нас ніхто не ашукае. — Мы сваіх беларускіх сялянска-работніцкіх паслоў будзем выбіраць, што за нас бедны народ стаяць...

Цягнік затрымаўся на станцыі. Пан Падліза парашыў перайсьці ў другі вагон, каб ня чуць апавяданьняў аб сабе.

Едучы ў другім вагоне, дзівіўся вельмі, скуль сяляне ўсе падрабязгі аб ім знаюць?..

Раптам, калі глядзь, аж спруцянеў са страху і валасы ёжыкам падняліся. У вагон увайшла жанчына з дзіцяням і... адразу накінулася на яго.

— Не, цяпер ужо не ўцячэш ад мяне. Жулік ты, ашуканец!

— А як-жа, людцы добрыя, зьвярнулася яна з плачам да прысутных, жыў са мной, жаніцца дакляраваў, а пасьля ўцёк... А аказваецца ён даўно жанаты. Гірад няшчасны!

Вось табе! Вось табе, вось, вось!—і жанчына з канцюрамі, як каршун, кінулася на пана Падлізу.

Падліза, утуліўшыся ў футра, круціўся, як вюн на скавародзе.

Абступілі яго бабы і пачалі цягаць так, што аж пух з футра сыпаўся.

— Браточкі! гэта-ж наш пасол Падліза,—пазнаў нехта з прысутных. Гэта — той, што нам зямлю дакляраваў, той...

І бух! гнілое яблыка паляцела Падлізе проста ў акуляры.

— Яйкамі яго, яйкамі!

І сырыя яйкі паляцелі з усіх канцоў вагону.

Падліза дзіка закрычаў, рвануўся да дзьвярэй і... бяз памяці паляцеў на ўсім ходу з цягніка.

Доўга стаяў у вагоне вясёлы рогат і плач ашуканай жанчыны.

* * *

Ужо віднела, калі пан Падліза прыйшоў да сябе. Доўга ён ня мог паварухаць ані нагамі, ані рукамі. Увесь ён быў зьбіты і абдзёрты.

Але неяк сабраўся з сілай, устаў і кульгаючы пайшоў да незнаёмай яму вёскі.

Выгляд яго быў дзікі і страшны. Усе лічылі яго за дурнога, які ўцёк з места. Боязна ўцякалі ад яго і засоўвалі дзьверы ў хатах. Толькі сабакі з усей вёскі абступілі яго і цягалі за адарваўшыя яшчэ фалды ягонага футра.

Толькі пасьля цяжкай працы ўдалося яму ўпрасіць аднаго селяніна пусьціць яго ў хату. Ён абмыўся, абчысьціўся і папрасіў фурманку да бліжэйшай станцыі.

Панура сядзеў і маўчаў пан Падліза. Гэты прыгожы лес, праз які ехалі яны, у якім узгадаваўся і вырас Падліза здаваўся яму цяпер нейкім дзікім і страшным. Здавалася, што за кожнай сасонкай і ёлкай прытаіўся нейкі Страх, гэты Страх пазнае яго і выцягне на яго свае сьмяротныя лапы.

— Едзь хутчэй,—сказаў ён фурману.

А фурмана брала цікавасьць: „ці ня злодзей які, — думаў сам сабе, бо гэтак абдзёрты і хутчэй сьпяшаецца ехаць“. Нарэшце ён ня вытрваў і запытаўся:

— А пан далёка ад станцыі едзе?

— Да Сасноўкі.

— Да Сасноўкі?! — зьдзівіўся селянін. А скуль-жа пан там, я-ж усіх там добра ведаю?

— З Максімавіч.

— З Максімавіч?! А, выбачайце, як вас па прозьвішчу.

— Падліза.

— Падліза?! Можа пасол?

— Але.

— Тпрру!.. Як ты пасол Падліза, дык злазь з возу. Бадай ты недачакаў, каб я цябе вазіў! Ашукаў народ, дый хвастом накрыўся... Злазь з возу, кажу я табе!..

— Дзядзечка...

— Злазь, бо—бо пугаўём!

— Але-ж я...

Селянін скочыў з возу і пацягнуў Падлізу за каўнер.

— Прэч, ашуканец, прэч! Калі панам прадаўся,—хай цябе паны і возяць.

Кульгаючы, па калені ў сьнезе пацягнуўся пан былы пасол Падліза і зьнік за лесам.

Такі самы лёс чакаў яго і ў хаце.

Янка Маланка.

Форма рэклямацыі проці ўнясеньня ў сьпіс асоб, ня маючых выбарчых праў.

REKLAMACJA.

Do Obwodowej Komisji Wyborczej w . . . .
(Imię i nazwisko), zamieszkały w . . . . uprasza
o wykreślenie ze spisu wyborców do Sejmu i Senatu (miasta) . . . .
(gminy) . . . . (takich to) . . . . gdyż oni . . . .
(даваецца факты, церав што яны ня маюць права быць унесены ў сьпіскі).
(Мяйсцовасьць) . . . . . . (Подпіс) . . . . . .
(Дата) . . . . . .

Рэклямацыі аб неўмяшчэньні ў сьпіскі выбаршчыкаў Абвадовая Камісія разглядае неадкладна і ў выпадку слушнасьці ўпісвае прозьвішча няўнесенага. Камісія можа зажадаць ад уносячага рэклямацыю прадстаўленьня дадатковых доказаў.

Калі Абвадовая Камісія прызнае рэклямацыі, то яна наведамляе аб гэтым заінтарэсаваную асобу праз пошту (за зваротным наквітаваньнем), або даручае наведамленьне пад расьпіску яго, ці паўналетняга сябра яго сям'і, а адначасна публікуе абвяшчэньне пра адмову ў памешканьні Камісіі (арт. 36).

Пра ўнясеньне рэклямацыі і зьмяшчэньне ў сьпіску асобы, ня маючай выбарчага права, Абвадовая Камісія абавязана ў працягу 24 гадзін наведаміць аб гэтым асобу, выбарчае права якое падлягае сумліву (вызначыўшы 3-хдзённы тэрмін ад маманту даручэньня паведамленьня, але не пазьней 48 дня ад абвяшчэньня выбараў, для ўнясеньня супраціву на пісьме, ці на славах з зазначэньнем у пратаколе. Паведамленьні выконываюцца спосабам, зазначаным у папярэднім артыкуле. Абвадовая Камісія разглядае рэклямацыі і запярэчаньні, выносіць пастанову і паведамляе вышэйзначаным спосабам заінтарэсаваныя стораны (арт. 37).

На пастанову Абвадовае Выбарчае Камісіі, кожны выбаршчык мае права падаць жалабу ў Акружную Выбарчую Камісію (арт. 38).

Пасьля зацьверджаньня пастановы Абвадовае Камісіі, апошняя спраўляе і ўкладае сьпіскі выбаршчыкаў.

Найпазьней у 52 дзень—ад абвяшчэньня выбараў, Абвадовыя Камісіі перасылаюць да Акружных Выбарчых Камісіяў абодва экзэмпляры напраўленых сьпіскаў выбаршчыкаў разам з актамі падаdes рэклямацыяў, запярэчаньняў і жалаб. Запярэчаньні, якія надыходзяць да Абвадовае Камісіі да 56 дня ад абвяшчэньня выбараў, павінны неадкладна адсылацца да Акружнае Выбарчае Камісіі (арт. 39).

Акружныя Выбарчыя Камісіі, разгледзеўшы пратэсты і зажаленьні, аканчальна зацьвярджаюць сьпіскі выбаршчыкаў і перасылаюць іх найпазьней на 62 дзень ад абвяшчэньня выбараў Абвадовым Камісіям, а трэці папраўлены экзэмпляр сьпіскаў адсылаюць начальніку гміны (арт. 40).

Заінтарэсаваныя асобы, ці Акружны Выбарчы Камісар можа абжалаваць пастанову Акружнае Выбарчае Камісіі беспасярэдне перад Найвышэйшым Судом у працягу 48 гадзін ад даручэньня пастановы. Унясеньне жалабы не ўстрымлівае далейшае выбарчае працы (арт. 41).

Ад часу зацьверджаньня Акружнай Выбарчай Камісіяй сьпіску выбаршчыкаў у тым сьпіску можна рабіць папраўкі, толькі згодна пастановам Найвышэйшага Суду, памерлых можна выкрэсьліваць са сьпіску толькі тады, калі прадстаўлена мэтрыка аб сьмерці выбаршчыка (арт. 42).

Найпазьней на 66-ты дзень ад дня абвяшчэньня выбараў Старшыня Абвадовае Выбарчае Камісіі выкладае сьпіс выбаршчыкаў на 5 дзён у выбарчым будынку для прагляду, каб заінтарэсаваныя маглі даведацца, ці прыняты пад увагу іх рэклямацыі, каб падаць жалабу ў Найвышэйшы Суд (арт. 43).

Р. Н. О. у Вялейцы.

Надеячы прыехалі панкі з Р. Н. О. вядомыя манархісты Бутурлін і Кузьміцкі ў Вялейку пав. Яны думалі, што іх лёзунгі абединой неделимой" знойдуць водклік у беларускай працоўнай гушчы і што пад тым ці іншым сосам ім удасца ўбіць іх у гэту гушчу. Але сьвядомая беларуская Вялейка паказала ім, што Беларускі Народ жыве сваімі чыстымі працоўнымі ідэаламі, якімі і кіруецца ў жыцьці наагул і пры выбарах асабліва, і што няма месца сярод яго розным прайдзісьветам чарнасоценцам.

Правакацыйная работа вызваленцаў знoў узнялася

Знoў зьявіліся вызваленцы на нашым зямлі па мандаты. Як ведама, пры выбарах у 1922 г. ім удалося атуманіць шмат дзе беларускіх сялян і правясьці ў Сойм некалькіх паслоў. Тады вызваленцы нарабілі шмат гуку, выступаючы, як абаронцы працоўнага люду і закідаючы сваімі адозвамі ў беларускай мове увесь наш край. У працягу 5 гадоў працы ў Сойме ні чуваць было з боку вызваленцаў ніводнага слова, сказанага на абарону Беларускага Працоўнага Народу. Наадварот, яны увесь час вялі ў Сойме сваю здрадніцкую работу, старанна, дзе толькі можна і чым толькі можна, шкодзілі беларусам. А цяпер знoў успомнілі на беларускія мясцовасьці са сваімі фальшывымі клічамі і абяцанкамі, знoў засыпалі ўвесь край нашых адозвамі ў беларускай мове, спадзяючыся, што знoў удасца ашукаць беларускага „chłopa“.

На ўсю вашу ашуканчую працу, панкі з Вызваленьня, можна адказаць словамі нашага найвялікшага песьняра—Я. Купалы:

„Цяпер і вы загаварылі
З апекай вышлі, як з зямлі,
А што-ж дагэтуль вы рабілі?
А дзе ж дагэтуль вы былі“?

Дык ведайце-ж, панкі з Вызваленьня, што ваша подлая работа, якую вы вялі і вядзеце праз увесь час, ведама кожнаму беларускаму селяніну, кожнаму беларускаму работніку і ніякія хітрыкі вам ужо не памогуць, тым больш не паможа вам ваш саюз са спэкулянтам беларускаю справаю Умястоўскім, бо ж гэты саюз яшчэ выразней высьвятляе, хто вы такія і да чаго імкнецёся.

Прэсавая кампанія супроць Т-ва Беларускае Школы.

Віленская польская прэса пачала вострую акцыю супроць найстарэйшай і наймацнейшай беларускай культурна-асьветнай арганізацыі—Т-ва Беларускае Школы. Як ведама, Т-ва Б. Ш. вядзе барацьбу за беларускую школу, дык за гэта, відаць, яно стала не да смаку віленскім пісакам. Відаць, яны хочуць выкарыстаць перадвыбарны час, каб ачарніць Т-ва перад уладамі, прычапіўшы яму палітыку, і прывясьці да ліквідацыі. Што-ж. усё можна пад сонцам, тым больш у Польшчы.

Расейскія чорнасоценцы заварушыліся.

Як ведама, расейскія чорнасоценцы ніяк ня могуць пагадзіцца з тым станам рэчаў, які існуе на тэрыторыі бышай расейскай імпэрыі. Ім ня могуць пагадзіцца, што беларусы і украінцы на „крэсах“ ужо перасталі быць іхнімі людзьмі і усё кажуць, што гэта "исконно-русские" і хочуць асноваць на іх базу да сваіх імкненьняў да „единой неделимой“. Таму расейскія чорнасоценцы заварушыліся ў цэлым нашым краі перад выбарамі і зьбіраюцца ашукаць нашых беларускіх сялян і работнікаў у часе выбараў, думаючы выкарыстаць іх галасы на сваіх чорнасоценных кандыдатаў.

Але дарма паночкі! Беларускі працоўны люд даўно ўжо акляйміў вас праклёцьцем за вашу чорную працу ранейшую і цяперашнюю, ён зразумеў, хто ён, што яму трэба і хто зьяўляецца сапраўдным яго абаронцам. Дык дарэмны высілкі Р. Н. О. (Руское Народное Об'единение) і разьезды па нашых вёсках і мястэчках, няма на нашых землях грунту для вашай бруднай работы!

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Перагаворы Пяста і Хадэцыі.

Як аднагалосна паведамляе прэса, перагаворы аб заключэньні выбарнага блёку між Пястам і Хадэцыяй даходзяць канца. Прынцыпова справа ўжо вырашана. Абгаварваюцца яшчэ толькі тэхнічныя справы. У зьвязку з гэтым 5 ст. адбылося паседжаньне Галоўнай Управы Пяста.

Выбарная сітуацыя эндэкаў.

Выбарная сітуацыя эндэцыі за апошнія часы пагоршала. Яе стараньні стварыць выбарны блёк супольна з Хадэцыяй і Пястам дагэтуль не знаходзяць водгуку з боку гэтых партыяў. Як бачым, у перагаворах Хадэцыі і Пяста аб выбарным блёку эндэкі ня прымаюць учасьця, ня гледзячы на блізкі канец тэрміну прадвыбарных торгаў.

З гэтага можна судзіць, што эндэцыя пойдзе на выбары ізалявана.

Бунд і Поалей-Сіон Лявіца.

Ад даўжэйшага часу вёўшыяся перагаворы між Бундам і Поалей-Сіон Лявіцай разьбіліся. Характэрнымі для жыдоўскай сацыял угоды зьяўляюцца прычыны гэтага разьбіцьця. Як паведамляе „Газ. Варшавска“ на падставе камунікату Бунда, перагаворы разьбіліся ня з поваду прынцыповых разыходжаньняў у справе выбарнай плятформы тактыкі і г. д., а з поваду нязгоды ў пытаньні падзелу мандатаў. Гэтак Бунд дамагаўся 2 першых мандатаў, ахвяроўваючы Поалей-Сіону 3. На гэтую прапазіцыю Поалей-Сіон Лявіца ня прыстала, дамагаючыся другога, а ня трэцяга мандата. Больш яскравага прыкладу парлямэнцкага крэтынізму і пагоні перадусім і за ўсякую цану за мандатамі з боку жыдоўскай сацыял-угоды ня трэба. Ня лішне адзначыць, што на папярэдніх выбарах гэтыя групы праваліліся і ні водная з гэтых ня мела свайго пасла ў былым Сойме. Апэтыту на мандаты хоць адбаўляй.

Выбарная пазіцыя эндэкаў

У сваей апазіцыі да санацыі прадстаўнікі польскага мяшчанства на-дзіў пасьлядоўны. Гэтая пасьлядоўнасьць дайшла да таго, што навет на Усходніх Крэсах — супроць усялякіх спадзяваньняў эндэцыя разьбівае адзіны агульна-польскі буржуазны фронт. Асабліва яскрава выявілася гэта ў Львове, дзе эндэкі выступілі з камітэту нацыянальнага блёку з прычыны яго дадатняга адношаньня да ўраду Пілсудскага. Гэтая пасьлядоўная да канца апазіцыйная пазіцыя эндэкаў выклікала цэлую буру з боку санацыі. Абурэньне на эндэкаў дайшло ў санацыйнай прэсе да таго, што па адрасу эндэцыі кідаецца гэтак моднае цяпер у санатараў абвінавачаньне ў... zdradzie stanu.

Пазіцыя Хадэкаў.

У параўнаньні з эндэцкай пазіцыяй, пазіцыя хадэкаў у адносінах да ўраду ня так выразна і пасьлядоўна: гэтак у Львове аб выхадзе яе з Komitetu Narodowego ня чуваць. Наадварот, ня гледзячы на сваю „апазіцыю“ да ўраду, яна неяк абмяжоўвае сябе ад эндэкаў. Прычын гэткай нявыразнасьці адносін трэба перадусім шукаць у палітыцы Ватыкана (папы), які шукае паразуменьня з Пілсудскім. Калі навет у гэтай выбарнай кампаніі хадэцыя і выступіць у характары апазіцыі, дык на парлямэнцкім грунце аб „апазіцыі“ ня будзе і мовы.

Спыненьне Даразных Судоў.

Agencja Wschodnia публікуе інтэрв'ю з віцэ-міністрам справядлівасьці Царам у справе даразных судоў. Цар заявіў, што ўрад ня думае прадоўжываць распараджэньне аб даразных судах так, што гэткім чынам з 2-I гэтыя суды на прасторах былой Расеі ўжо не абавязваюць. Што датычыць другіх зямель, дык там для спыненьня даразных судоў трэба выдаць спэцыяльны дэкрэт; пастанова аб гэтым аднак ня вынесена.

Узрост беззрабоцьця ў Польшчы.

За тыдзень ад 17 да 24 сьнежня лічба беззработных у Польшчы ўзрасла на 8.175 асоб, дасягнуўшы ўжо цыфры 160.440...

Заграніцай.

Пасьпехі польскай дыплёматыі ў Латвіі.

Радавы ўрад, які толькі-што здабыў вялікі пасьпех, заключыўшы вельмі важны для СССР гаспадарчы і палітычны трактат з Латвіяй, пільна сачыў за адбываўшыміся нядаўна перагаворамі паміж Латвіяй і Польшчай—у справе таргавага дагавору.

Як высьветліў толькі-што—у гутарцы з карэспандэнтам радавай газэты — латвійскі міністар Цэленс, перагаворы гэтыя давялі пакуль-што толькі да падпісаньня—часовай умовы ў справе мытных ставак. Пры гэтым міністар „супакоіў“ радавага карэспандэнта, што Польшча атрымала ад Латвіі — толькі тыя-ж звычайныя мытныя варункі, якімі карыстаюцца ўсе іншыя дзяржавы, маючыя наладжаныя гандлёвыя зносіны з Латвіяй. Але Польшча не атрымала зусім тых асаблівых прывілеяў, якія дадзены Латвіяй толькі найбліжэйшым да яе эканамічна і палітычна дзяржавам: Радаваму Саюзу, Фінляндыі, Эстоніі і Літве.

Гэткім чынам, сама польская прэса слушна кажа. што — „пасьпехі польскай дыпляматыі ў Латвіі—невялічкія“.

Урадавы крызіс у Латвіі.

Як ведама, латвійскі сацыялістычны ўрад з вялікімі высілкамі правёў праз Сойм зацьверджаньне трактату прыязьні і эканамічнага сужыцьця з Радамі. Правёў, ня гледзячы на страшэнны апор рэакцыйна-буржуазнай паловы Сойму і лўгн націск з боку вельмі ўплывовай яшчэ ў Латвіі англійскай агентуры.

Але гэтая перамога ў канцы—каштавала жыцьця самаму ўраду Скуеніса-Цэленса. Яго большасьць у Сойме, і без таго невялічкая — штосьці ўсяго 6 галасоў — пачала таяць. І, калі нядаўна апошні голас гэтай былой урадавай большасьці перайшоў на бок апазіцыі, тады ўрад ня стаў навет чакаць галасаваньня даверыя дый — падаў у адстаўку.

У часе крызісу аднак-жа высьветлілася, што — ані водная з тых буржуазных групаў Сойму, якія разам—сваей апазіцыяй ураду — выклікалі яго адстаўку,—ня могуць, ці можа ня хочуць стварыць новага ўраду. Гэткім чынам высьветлілася — палітычнае банкруцтва правай паловы Сойму, зваліўшай сацыялістычны Урад. Але побач з гэтым высьветлілася і нешта яшчэ.

Справа ў тым, што гэтая правая палова Сойму, галасаваўшая (пры дапамове, можа, — п. Чэмбэрлена...) проці трактату з Радамі—дый на гэтай справе зваліўшая ўрад,—павінна была-б, стаўшы на месца зваленага ёй ураду—зараз жа—скасаваць гэты трактат. Але, відаць, на гэткі рызыканцкі крок, які можа зруйнаваць гаспадарча, але датаго-ж небясьпечны, можа, і палітычна для краю,—латвійская буржуазія пакуль ня мела адвагі. Ясна што трактат з Радамі павінен стаць трывалай падставай латвійскай палітыкі... У гэтым факце — вялізарнае паражэньне англійскай агентуры ў Латвіі...

Цяпер, як даносяць газэты,—пасьля таго, як прэзыдэнт бяз вынікаў прапанаваў тварэньне ўраду ўсім клюбам Сойму, — ня выключаючы і клюбаў нацыянальных меншасьцяў,—ён павінен быў ізноў зьвярнуцца да сацыялістаў.

Апошняя тэлеграма кажа, што правадыр сацыялістаў Гольманіс ізноў распачаў перагаворы аб стварэньні новага ўраду—коаліцыі лявіцы з цэнтрам. Вось-жа значыць—пасьля крызісу сацыялісты ўзноў бяруць уладу — значна падмацаваныя ў сваім аўтарытэце.

Навагоднія прадбачаньні францускай прэсы.

Карэспандэнт „Кур. Вар.“ з Парыжа(?) сьцьвярджае, што амаль ня ўся француская прэса прадбачыць у новым годзе—ачышчэньне Надрэйні ад акупацыйных войскаў; значная частка прэсы прадбачыць перагляд „пляну Доўса“ (нямецкіх адшкадаваньняў), а сацыялістычная прэса піша аб магчымасьці — перагляду мірных трактатаў і граніцаў. „Імкнучыся да міру, сацыялістычная лявіца сваімі неагляднымі лёзунгамі можа якраз выклікаць вайну“, страшыць карэспандэнт.

Характэрна таксама, што француская прэса, пішучы аб пасьпехах „мірнай кансалідацыі Эўропы“, амаль не памінае... Лігі Нацыяў. (Здаецца-ж, яшчэ-ж не — нябожчыка)!..

Праект перанясеньня Лігі Нацыяў з Жэнэвы ў Вену.

Венскія газэты даносяць, быццам ува ўлоньні Лігі Нацыяў спарадзілася думка аб перанясеньні сядзібы Лігі Нацыяў з Жэнэвы ў Вену. Быццам асабліва заінтарэсаваны ў гэтым пляне — Чэха-Славаччына і Італія. Англія згодліва на тое, як пастановіць Францыя.

„Тэхнічным матывам“ пераносу выстаўляюць страшэнную дарагоўлю жыцьця ў Швайцарыі... Але ж ясна, што плян гэты мае яшчэ і скрытую мэту перашкодзіць хаця-б тым—імкненьню Аўстрыі да злучэньня з Нямеччынай, кінуўшы беднай сталіцы першай удадатак некалькі дзесяткаў мільёнаў бюджэту Лігі Нацыяў, якія астануцца ў краі...

Новы скандал з італьянскім фашызмам: Мусоліні тайна высылае аружжа Вэнгрыі.

Аўстрыяцкія мытныя ўлады, кантралюючы цягнікі, ідучыя з Італіі і ў Вэнгрыю (праз тунэль Сэн-Готард), знайшлі аж пяць вагонаў, у якіх былі—пад відам розных тавараў — накладзены разабраныя кулямёты... Калі аўстрыяцкія ўрадоўцы хацелі затрымаць незаконны транспарт (забаронены Вэрсальскім Трактатам), тады вэнгерскія пагранічнікі гвалтам вырвалі вагоны дый пераказалі іх на вэнгерскую тэрыторыю. Аўстрыяцкія ўрадоўцы зараз-жа спыніўшы чыннасьць, паехалі ў Вену дый нарабілі там галасу. Забіла трывогу і прэса, асабліва дэмакратычная, слушна шальмуючы Мусоліні які плюе сабе на падпісаны Італіяй Вэрсальскі Трактат, гатуючы сабе з Вэнгрыі саюзьніка проці Югаславіі — узбраяючы яго. Як ведама, Югаславія—якраз адзін з жандармаў, Малай Антанты, пастаўленых Вялікай Антантай — пільнаваць за тым, каб Вэнгрыя ня сьмела азбраяцца. А ў склад Вялікай Антанты ўваходзіць якраз Італія... „Стосуначкі“, мае паночкі, у Вэрсальскай Эўропе“!..

„Венскі і вэнгерскі ўрады шчыра імкнуцца—да зьліквідаваньня ўсяго... мытнага выпадку“, гумарыстычна дадае тэлеграма...

Байкот англійскай „канстытуцыі“ для Індыі.

Усеіндыйская Магамэтанская Ліга прыняла на кангрэсе пастанову — байкатаваць англійскую камісію, якая назначана англійскім віцэ-каралём Індыі (ці англійскім парлямантам)—дзеля стварэньня „новай канстытуцыі“ для Індыі. Такую ж рэзалюцыю прыняў усеіндыйскі кангрэс Індускай Рацыянальнай Рады. Прычына байкоту — тое, што англійская ўлада не паклікала для гэтай працы—ані воднага індуса.

Цікаўны „выпадак“ з амэрыканскай нафтай у Цянь-Дзіне.

У Цянь-Дзіне ўзарваны ў паветра дый згарэлі дарэшты вялізарныя склады нафты, якія жывілі „плыўкім вугальлем“ увесь Кітай...

Страты амэрыканскай кампаніі Стэндэрт Ойль аблічаны ў паўсотні мільёнаў даляраў...

Яшчэ важней, як гэтыя грашовыя страты, гэта тое, што цяпер пройдзе шмат часу, пакуль амэрыканская нафта здолее ізноў адбудаваць сваё становішча ў Кітаі, якое будзе зараз-жа занята яе... англійскім канкурэнтам...

Як ведама, англійская нафта вядзе страшэнна зацятую барацьбу на ўсім сьвеце з амэрыканскай, злучыўшайся з расейскай. Ведама і тое, што англійскія агенты цяпер ў Кітаі вядуць вельмі пасьпешна пляновую працу—на поўнае зьніштажэньне ўсялякага сьледу расейскіх уплываў, карыстаючыся пры гэтым—усімі спосабамі... Дык зусім магчыма, што — „пакутна“ мог лёгка здарыцца няпрыемны „выпадак“ і для амэрыканскай нафты, як аднаго з „саюзьнікаў“ бальшавікоў у Кітаі, а аднача сна і—канкурэнткі англійскай нафты на Далёкім Усходзе, аб які цяпер так ідзе Англіі...

Амэрыка творыць новую „Лігу Нацыяў“.

Як ведама, нядаўна амэрыканскі ўрад запрапанаваў Францыі заключыць з Амэрыкай—„саюз вечнага міру“... Француcкі ўрад спагадна адгукнуўся на гэтую прыемную прапазыку.

І вось, толькі-што дзяржаўны сэкрэтар па замежных справах Амэрыкі Кэллог даручыў францускаму паслу ў Вашынгтоне праект гэтага саюзу. Разам з праектам Кэллог даручыў паслу і ліст да міністра Брыяна, у якім піша, што—пасьля падпісаньня гэтага саюзу між Францыяй і Амэрыкай — можна будзе запрапанаваць і іншым дзяржавам — далучыцца да гэтага саюзу, які гэткім чынам мае імкненьне зрабіцца сусьветным — паўзор Лігі Нацыяў.

Статут гэтай „новай Лігі Нацыяў“ вельмі кароткі. Уступ у Статуце кажа, што саюзныя дзяржавы—выключаюць паміж сабой вайну на вечныя часы „да першай косьці“, як гаворыцца ў ведамай байцы аб двух верных прыяцелях—сабаках...

І арт. кажа аб тым, што сябры саюзу павінны перадаваць спорныя справы—палюбоўнаму суду.

ІІ. арт. зараз жа абмяжоўвае гэты абавязак, кажучы, што ўсе чыста праўныя спорны павінны аддавацца на вырашэньне Гаагскаму Трыбуналу, але ўжо — у разе згоды абедзьвюх старон.

III. арт. кажа, што Статут гэты ня мае сілы ў справах чыста ўнутраных, або — датычучых стасункаў сябра саюзу да „трэцяй дзяржавы". Гэта значыць, што—калі, напрыклад Амэрыка праглыне рэспубліку Нікарагуа, ці якую іншую, дык сябра-саюзьнік павінен маўчаць...

У тым-жа арт. дадана яшчэ, што эўрапэйскія сябры асабліва ня маюць права клікаць Амэрыку „ў суд"—ані ў Гаагу, ані дзе інш.,—у справах, датычучых абедзьвюх Амэрыкаў—Паўдзённай і Паўночнай (так-званая „дактрына Монроэ", якая кажа, што — „Амэрыка для амэрыканцаў", ці што—Эўропа ня мае права мяшацца ў амэрыканскія справы наагул!..).

Цяпер ясна, чаму гэта Амэрыка не хацела далучыцца да жэнэўскай Лігі, але — творыць сваю ўласную — новую... Амэрыка хоча сама мець голас у справах Эўропы дый усяго сьвету, але весь, толькі ня хоча—даць Эўропе дый усяму сьвету голас у справах амэрыканскіх. Весь гэта і складае зьмест знамянітай „доктрыны Монроэ"... (аднаго з даўнейшых прэзыдэнтаў Амэрыкі). Дзеля таго адразу пасьля навароту з Эўропы дамоў страціў усялякую папулярнасьць у краі слаўны пераможца ў Вялікай вайне прэзыдэнт Вільсон, што ён — згадзіўся падпісаць ад імя Амэрыкі Статут Лігі, — парушаючы гэтую „доктрыну Монроэ", якая дзесяткі гадоў зьяўляецца ўжо традыцыйнай падставай усей замежнай палітыкі Амэрыканскіх Штатаў. Як ведама, амэрыканскі Сэнат заразжа—зьняў подпіс Амэрыкі з статуту жэнэўскай Лігі Нацыяў...

З Т-ва Бел. Школы.

Да грамадзянства Слонімскага павету.

Слонімская Акружная Управа Т-ва Беларускае Школы, каб дапамагчы вучням беларускіх гімназіяў, ладзіць на Каляды ад 7 да 15 студзеня тыдзень збору ахвяраў, як грашыма так і натурай, у Слонімскім павеце, а на 12 студзеня скарбонкавы збор ў Слоніме.

Грамадзяне! памятайце, што школа — гэта кузьня, з якое выходзяць барацьбіты за лепшую будучыню. Сіла і моц кожнага народу ў ягонай інтэлігенцыі. Наша нядоля ў адсутнасьці інтэлігенцыі. Апрача 4 беларускіх гімназіяў, мы ня маем ніводнае сярэдняе школы, дык Грамадзяне, усе, як адзін, адгукнецеся ў гэты тыдзень, тыдзень помачы нашай беднай вучнёўскай моладзі.

Памятайце, што нашы гімназіі не атрымоўваюць урадавае дапамогі і іх праца і разьвіцьцё залежыць ад Вашае ахвярнасьці. Няхай ніводзін Беларус не адмовіцца злажыць пасільную ахвяру грашыма, або натураю ў гэты тыдзень. Мы бедныя, але нас мільёны і толькі праз ахвярнасьць і арганізаванасьць мы выйдзем на сьветлы шлях грамадзкага жыцьця.

Асаблівую ўвагу на гэты тыдзень павінны зьвярнуць сябры Т-ва Беларускае Школы. Асобы, якія будуць рабіць зборы ахвяр, мусяць узяць у Акружнай Управе пасьведчаньне на права збору.

Ахвяры скіроўвайце ў Акружную Управу Т-ва. Слонім, Ражанская—55.

Старшыня: Жыткевіч.

Наша хроніка.

Арышт грам. Язэпа Шнаркевіча. Грам. Язэп Шнаркевіч, якога ня так даўно выпусьцілі з Лукішак, зноў арыштаваны 4-га студзеня. Прычыны арышту пакуль-што ня ведамы. У той-жа дзень заарыштаваны і грам. А. Коўш.

Паседжаньне новавыбранай Галоўнай Управы Т-ва Белар. Школы. 3-га студзеня г. г. адбылося першае паседжаньне новай Галоўнай Управы Т-ва Белар. Школы для выбараў прэзыдыуму. Выбраны—старшыня б. сэнатар А. Уласаў, віцэ-старшыні—Ів. Савіцкі і А. Трэпкаа, сэкрэтары — Я. Шнаркевіч і Р. Шырма, скарбнік—М. Кепель.

Паседжаньне Ураду Белар. Выд. Т-ва. Таго-ж 3-га студзеня адбылося паседжаньне новага Ураду Белар. Выд. Т-ва. Выбраны — старшыня—А. Трэпка, сэкрэтар—Я. Шнаркевіч, скарбнік—д-р І. Дварчанін.

Сельсаюзьнікі і хадэкі зусім запрадаліся жыдоўскай буржуазіі і літоўскім фашыстам. Так ведама ёсьць, што яны аддалі 3 мандаты (ужо і аддалі!) літоўскай буржуазіі. Як ведама, па самай карыснай для літвіноў статыстыцы іх у Польшчы налічаецца ўсяго каля ста тысяч. Калі ўзяць пад увагу, што на адзін мандат прыпадае 60 тысяч людпасьці, што літвіны ня жывуць компактнай масай, а раскіданы кучкамі па некалькіх вакругох — то ўсякі скажа, што сельсаюзьнікі і хадэкі ня скупыя на мандаты. Але ўжо наперад можна сказаць, што нічога не атрымаюць яны на выбарах, бо сяляне гоняць мятлой іх з вёскі, як здраднікаў сваіх інтарэсаў. Дык можна дзяліцца і з літвінамі тымі мандатамі, што маюць у крамцы Ярэміч і Рагуля.

Цікава, што выстаўленьне кандыдатаў на пасоў у многіх вокругах сельсаюзьнікі і хадэкі аддаюць жыдоўскай і літоўскай буржуазіі.

Знэрваваны Умястоўскі. Ходзяць па Вільні чуткі, што пісьмы ў рэдакцыі радыкальных газэтаў аб рэдактарстве „Нашае Долі" да таго знэрвавалі пана Умястоўскага, што ён, як у шале, ходзіць па Вільні і шукае нумароў „Нашае Долі", прапануючы за адзін нумар бачную суму ...500 (пяцьсот) злотаў. Што п. Умястоўскі можа плаціць за нумар старое газэты 500 злотаў — гэта сьведчыць, што ён такі можа плаціць (чаму не?!). Але якая карысьць будзе ад гэтага яму —ён хіба й сам ня ведае. Можам сказаць п. Умястоўскаму, што адзін верш, з прозьвішчам „Дзядзька Пранук" — там ёсьць, але таксама поруч з ім стаіць другі псэўдонім—Чыжык Ашмянскі, які паказвае ні на каго іншага, як на знамянітага цяпер сваімі „пералётамі" п. віцэ-прэзыдэнта Вільні — Чыжа, асобу якога беларуская прэса ўжо высьветліла. Ну што-ж—„пара гнядых"!

Што ж тычыцца рэдактарства — то напэўна п. Умястоўскі там свайго прозьвішча ня знойдзе. Урэшце—ня варта фатыгі, пане Умястоўскі! Для беларускіх працоўных гушчаў куды цікавей ведаць, што такое прадстаўляеце Вы цяпер. Дык для каго-ж сакрэт, што Вашаю працаю кіруе „злы дух" б. Грамады—п. Гурын, і Вы разам з ім працуеце на польскую буржуазію, ды смачна цалуецесь з ёю.

Ня думайце, пане Умястоўскі, што беларускія сяляне і работнікі такія-ж наіўныя, як прыкладам Вы, і гатовы будуць таксама з Вамі цалавацца, як Вы дзе з кім.

Лепей ужо, п. Умястоўскі, зьлязайце з даху ды ня псуйце гонтаў. Слабога з Вас, мусім прызнаць, польская буржуазія мае служку, калі мусіць купляць валер'янавыя каплі.

Суды... суды. Пінскі Акружны Суд на выязной сэсіі ў Беразьці разглядаў справу 14 камуністаў, з якіх 11 засуджаны на 4 гады вастрогу кожны, 3 апраўданы.

Марная ўцеха „Dziennika Wileńskiego". Орган польскіх эндэкаў, у сваей бясьсільнай злосьці на немагчымасьць затрымаць усё растучую сілу руху беларускіх працоўных — усьцяж корміць сваіх „набожных" чытачоў яўна брахлівымі весткамі, высысанымі з пальца — каб хоць гэтым кіданьнем каменьня ў хату шкодзіць гэтаму руху.

На гэты раз аб'ектам абстаўскага органу зьявілася Беларускае Выдавецкае Т-ва „Сьвятло" орган піша, што на здабытых паведамленьнях Т-ва сканстатаваны факт надзікавеньня масамі беларускай кніжкай, якая нібы стала ляжаць на паліцах і... поўна казка, бо Обст іх забраў. Радзілі-б панэльму браху сабраць фактычны матэр'ял, хацяж-бы на газетах — а то „Сьвятло" орган выклікае зусім на друкову газэту. Няхай лепей б. Обст плача аб тым, што з ростам працоўнай сьвядомасьці, зьменшваецца у Вільні дэвотак.

Лік беззработных усьцяж расьце. Урад пасярэдніцтва працы зарэгістраваў у мінулым тыдні на тэрыторыі Віленскага ваяводзтва 4478 беззработных. На м. Вільні прыпадае 4175 беззработных. Такім чынам за адзін тыдзень лік беззработных павялічыўся на 66 чалавек.

Беларусы у Чэхаславаччыне.

(Карэспандэнцыя з Прагі).

Беларускае студэнцтва ў Празе з асаблівай увагай адносілася да апошніх падзей у сувязі з польска-літоўскім канфліктам, які, як ведама, скончыўся ў Жэневе „Міралюбова", хоць і зьвярнуў на сябе ўвагу ўсяго сьвету. Цікавіліся і замяшаньнем пытаньні ў праўленьні беларускае зусім зразумела — справа аб Вільні, з якой многія находзяць родам і зьвязаны беларускім адраджэнскім рухам, аб якой амаль усе заграмнічная прэса пісала, як аб месьце ці то выключна літоўскім, ці то польскім. Праўда, былі надаваны пасобныя арганізацыі заклапочаныя фактычным станам справы ў прэсе, але найменей было-б, каб праўда беларуская прэса таксама падала свой голас у справе Вільні: праўда — пісала не пісала „Віленскага Кугніса", але толькі аб Вільні, не літоўскай сталіцы(!). Таксама у „Сав. Беларусі" на Віленскаму пытаньні А. Цьвікевіч зьмясьціў стацьцю, рэшта беларускай прэсы задавольвалася зьмяшчэньнем афіцыяльных тэлеграмаў. Гэтыя наўкаліш беларусаў у адказны момант — абароны сваіх этнаграфічных земляў ад новага награжаючага падзелу, зьяўляецца фактам бясспрэчна ад'емным, і ў будучыне, мусім быць напраўлены па меры магчымасьці. Асабліва добра надхапіла істоту і адказнасьць справы Беларускае Культурнае Т-ва ім. Ф. Скарыны ў Празе, якое дня 14 XII г. г. наладзіла рэфэратную зборку. На прачытаньні рэфэрату „Вільня беларускі культурны і эканамічны цэнтр" і дыскусіі, у якой прымалі ўдзел сябры і госьці, была вынесена ніжэйшага зьместу рэзалюцыя:

„Усьцяж вядуцца спрэчкі паміж урадамі Літвы і Польшчы ў пытаньні аб дзяржаўнай прыналежнасьці старадаўнай сталіцы былога Вялікага Княства Беларуска Літоўскага — Вільні з прылягаючымі да яе этнографічнымі беларускімі землямі; літоўцы і палякі на гэтых землях складаюць нязначную меншасьць, у той час як беларускі народ яе з прадвеку засяляе ў пераважнай большасьці ўсяго жыхарства і не адзін раз ужо надаў яскравыя факты свайго імкненьня да зьдзейсьненьня права вольнага самаазначаньня. Аб гэтым найкрасамоўней сьведчаць факты жывое запраўднасьці. Але як польскія, гэтак і літоўскія прэтэндэнты, ня лічацца з гэтымі фактамі і ў аднолькавай меры пагуцюць справу вольнага самаазначаньня беларускага народу. Гэта з усей ня прыкрытай шчырасьцяй была выяўлена імі ў часе апошняе сэсіі Рады Лігі Нацыяў у Жэнэве і ў друку. Сьцьвярджаючы гэта, агульна-рэфэратная зборка Беларускага Крывіцкага Культурнага Т-ва ім. Ф. Скарыны ў Празе, — зьвяртаецца з заклікам да ўсіх беларускіх арганізацыяў і партый, як заграніцай гэтак і ў краі, — каб зьвярнулі сваю пільную ўвагу на гэтую справу і ўключылі ў чарговыя заданьні свае дзейнасьці абарону Вільні, як беларускага культурна эканамічнага цэнтру, ад награжаючай небясьпекі новага падзелу Беларусі"...

(Канец рэзалюцыі ня можа быць зьмешчаны па цэнзурных умовах).

Прага 14-XII 1927 г.

Ад Рэдакцыі: Зьмяшчаючы гэтую карэспандэнцыю з рэзалюцыяй нацыяналістычнай часткі беларускага студэнцтва ў Празе-Чэскай—рэдакцыя падкрэсьлівае ўсю важнасьць закранутага прынцыпу самавызначаньня народу, як таксама і справы Вільні, як асяродку беларускае культуры ў Зах. Беларусі, пры гэтым акружанай з усіх бакоў беларускім насяленьнем. Мусім напомніць, што беларуская радыкальная прэса ўсьцяж баранiла і бароніць поўнага самавызначаньня народаў, як таксама і права беларусаў на Вільню. Аднак, для інтарэсаў беларускіх працоўных гушчаў пры тым палажэньні, у якім яны цяпер знаходзяцца, справа Вільні ня ёсьць на столькі вострай і патрабуючай такое пільнае ўвагі, як гэта здаецца карэспандэнту нацыяналістычнай часткі беларускага студэнства. Мусім сказаць, што беларуская радыкальная прэса ставіць барацьбу за самавызначэньне народаў і прыватна за — Вільню, зусім у іншую плашчыню, як гэта ставіцца ў карэспандэнцыі.

Бяручы за галоўную падставу сваей працы барацьбу за сацыяльнае вызваленьне беларускіх працоўных гушчаў з буржуазіяй, як роўна-ж і з іхнімі агентамі і згоднікамі, барацьбу за самую магчымасьць жыцьця гэтых гушчаў, за іх штодзённы кавалак хлеба, як роўна-ж і за права тварыць сваю культуру ці то за нацыянальнае вызваленьне — беларуская радыкальная прэса і выстаўленую справу Вільні ставіць у залежнасьць ад выніку гэтай барацьбы на галоўным фронце і то ня толькі барацьбы беларускіх працоўных гушчаў, а і барацьбы працоўных усіх народаў за іх вызваленьне. Беларуская радыкальная прэса пэўная ў тым, што з гэтым вызваленьнем справа Вільні вырашыцца сама сабой, а таму ў сучасны мамэнт ня лічыць сябе навет у праве займаць галоўнае ўвагі сваіх працоўных чытачоў вострым дамаганьнем бессярэчнага права беларускага народу на яго натуральны гістарычны і культурны цэнтр.

Што-ж тычыцца „Biełaruskaj Krynicy" — то ведама-ж, што яна ў гэтым адносінах (як і ў многіх іншых)... заўсёды ставіць жаданьні літоўскай буржуазіі вышэй інтарэсаў беларускага працоўнага народу. Памочніцай ў гэтым ёй зьяўляецца „Сялянская Ніва".

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

Праца „Прасьветы".

У газэце „Беларускае Слова" № 39 быў надрукаваны артыкул, у якім „Прасьвета" хваліцца, як „працуюць" яны на культурнай ніве. Я, як прысутны на спэктаклю, нібы наладжаным гуртком гэтае „Прасьветы", хачу сказаць, што ладзіла „Прасьвета", але сябрамі не належачымі да іх гуртка. Іх Паўлюкевіч на спэктакль заманіў рознымі абяцанкамі, як прывезьці балалайку, мандаліну, гітару і інш. Паўлюкевіч піша, што малады паэт Шах дэклямаваў пад воплескі глядзельнікаў свае вершы. Гэта мана. За некалькі дзён да спэктаклю Паўлюкевіч заказаў Шаху напісаць верш для глядзельнікаў „Прывітаньне", Шах пастараўся напісаць верш, пачатак якога будзе наступны:

„Вітаю вас пані і панічкі,
Ад сэрца шчырага вітаю!
І хай хвіліны гэтай ночкі
Вам будуць радасны — жадаю.
Вітаю тых, што ў цемры
Векі цэлыя прападалі,
Насілі ярмо, цярпелі зьдзекі і г. д.

Паўлюкевіч, выслухаўшы гэты верш, аж затросься са злосьці і забараніў яго чытаць. Замест гэтага верша „параіў" прачытаць „Воўк і ягнё". Весь і ўся дэклямацыя паэта Шаха. Больш нічога мы ня чулі, хіба-ж толькі панку Паўлюкевічу „чуваць" было штосьці іншае.

Глядзельнік.

Вялікая крыўда.

(Слонімшчына).

Вадай—што ні на кожным кроку беларус-змагар у сваіх дамаганьнях спатыкае перашкоды з боку ўлады. Ці то ў падачы дэкляраціяў, ці то ў настаноўцы спэктакляў, ці ў чым іншым, усё перашкоды й перашкоды. Аб іх гаворыцца, пішацца ў газэтах, з імі беларус змагаецца, на колькі хватае ў яго сілаў, надзеючыся, што ўрэшце яны ня будуць стаяць яму на дарозе да здабыцьця сваей школы і культуры, да паправы свайго быту.

Цяпер апошнім з пытаньняў — гэта выбары ў Сойм і Сэнат. Усе польскія партыі, а разам і беларускія заклікаюць змагара-беларуса галасаваць толькі за іх. А ці ведаюць яны, якую крыўду і перашкоду мае цяпер беларускі селянін. Павінны ведаць, бо мо' й яны трошкі прычыніліся да гэтага. А калі ня ведаюць, дык паслухайце. У уставе выбарчай гаворыцца, што абводы на выбарам павінны быць не далей як 6 кілямэтраў, а ў нашым павеце зрабілі так, што і ў 15 не ўбярэш адлегласьці да абводу з места находжаньня выбаршчыка. Напрыклад: гміны Чамерская, Міжавіцкая і Дзявяткаўская, дзе абводы ў наступных вёсках: у першай— в. Плаўскія і Адзгінавічы, у другой—в. Махначы і Клепачы, і ў трэцяй—в. Кільніца і Акунікава. Апрача таго, што адлегласьць вялікая, як гаворана, вышэй за 15 кілямэтраў, абводы, пераважна, вызначаліся ў вёсках з шляхоцкім насельніцтвам: в. Плаўскія, Адзгінавічы, або недалёка ад іх і там, дзе менш сьвядомых беларусаў. У другіх гмінах нашага павету таксама ня лепш. З усяго гэтага паўстае пытаньне: дзеля чаго гэта так зроблена і на чыю выгаду? Ну, ведама-ж, не на нашу мужыцкую, а на выгаду тых, што моцна крычаць і многа абяцуюць для беларуса-нэндзара. З аднаго боку крыўды і перашкоды ставяць, а з другога — галасаваць за сябе просяць. Сьмяхотна і крыўдна! І каму жаліцца на гэткія „дабрадзействы" „сільных сьвета гэтага"? Хіба толькі, як кажуць, шаўцу ў Глухаў.

Сяляне і сялянкі Слонімшчыны! Час выбараў недалёка і калі ён надыйдзе, дык усе да выбарчай урны, ні адзін голас наш не павінен прапасьці! Мы мусім, мы павінны ісьці на выбары, ня гледзячы ні на якія перашкоды! Мы пойдзем за 15, за 100 кілямэтраў, у самую Варшаву, і гэтым пакажам, што мы ўмеем змагацца за свае правы.

Пакрыўджаны змагар.

Для беларуса аднолькавае зельле.

(Баранавічы).

Ня чуваць штосьці было, каб хворага лячыла паліцыя. А вось у нас у Баранавічах гэтах званая „Павятовая Каса Хворых" лечыць бедных рабочых сяброў паліцыяй. Так лячылі 28-га сьнежня аднаго рабочага фірмы „Тармына", каторый прастудзіўся і прыйшоў да касы хворых да доктара, і стаў у калейцы з 4-ай гадзіны папалудню, у той час, калі пачынаецца выдача нумаркоў да дактароў. Калейка ўжо была вялікая. Хворы просіць нумарок да доктара. Паненка пытае „do jakiego". Попрошен до Абрамовіча—кажа хворы. Доктар Абрамовіч больш ня прыймае, бо ўжо ўсе 15 нумароў да яго выдана. — Хворы просіць даць другога доктара. Паненка адказвае, што і другі ўжо заняты. Хворы жаліцца, што яму венска і што яму трэба абавязкава быць у доктара, а дзеля гэтага просіць даць нумарок да якога-небудзь, які ёсьць. На дзіва паненка адказвае, што — ніжадпага.

Тады хворы пытае, як-жа гэта мае быць, калі ён вельмі кепска сябе чуе, і ня можа дастаць помачы, для чаго ж ён у такім разе лічыўся сябрам гэнае касы і плаціў стольні месяцаў грошы. На такую заяву хворага, падбягае пад акенка паніч г. з. ураднік касы хворых, і як-бы нічога да гэтага часу ня чуючы, пытаецца хворага (канешна папольску) „со pan sobie życzy". Хворы просіць даць нумарок да доктара, а калі ўсе дактары касы хворых заняты, дык даць яму грошы схадзіць да прыватнага доктара. Паніч зараз жа адыйшоў ад акенца, а з-за яго сагаварку голас кіраўнічкі касы (як яе называлі), каторая падбегла пад акенца і крыкнула хвораму, „proszę odejść od okna, a nie to natychmiast zawołam policję i skieruję pana do policji". Відаць, што хворы хаця быў і беларус, але добра зразумеў значэньне слоў пані кіраўнічкі. Працоўны чалавек знае справядлівасьць паліцыі і яе лякарства на Беларусі. „Дзякую вам за такую помач, на што-ж зьбіраць стольні людзей, каторыя стаяць яшчэ за мною і чакаюць таго, што я".

Паматаўшы галавою, пацягнуўся дамоў. Другія хворыя, бачучы гэта, шапталіся, каб ня чула кіраўнічка, што хворых пужае паліцыяй, ведома-ж не хвалілі такі парадак.

Пашоў дамоў і я, і ўсю дарогу думаў, як беларускаму чалавеку цяжка жыць на сьвеце. Тут споміналася, што нам — даюць камень замест хлеба і зьмяю замест рыбы. А яшчэ больш я думаў, каб гэтыя кіраўнічкі хутчэй апынуліся на нашым месцы, дык пазналі-б, як пужаць хворых паліцыяй.—Дык гэтага ад шчырага сэрца, панечка, табе жадаю.

Адзін з хворых.

Паштовая скрынка.

Сярмяжніку, Пяруну, Качану, Прысуджнаму і Глядзельніку. Карэспандэнцыі Вашыя заслабыя. Не зьмяшчаем. — Язэпу Садоўскаму, Палачаніну, Вераб'ю, Спагадліваму і Сокалу. Карэспандэнцыі атрымалі, скарыстаем.

Рэдактар-Выдавец: М. Гэрмановіч.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.